Источник: **«Звязда» - 2012-10-17**

## "Беларуская генетыка арыентавана на практычныя задачы"

**Навуковая канферэнцыя "Генетыка і біятэхналогія XXI стагоддзя: праблемы, дасягненні, перспектывы" праходзіла ў рамках X з'езда Беларускага таварыства генетыкаў і селекцыянераў на базе Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі. Мерапрыемствы прымеркаваны да 100-годдзя нараджэння заснавальніка беларускай генетычнай школы, акадэміка Мікалая Турбіна. Усяго ў Беларусь на навуковы форум прыехалі навукоўцы і спецыялісты з Расіі, Украіны, Казахстана, Польшчы і Латвіі.**

— Мікалай Турбін — гэта чалавек, які фактычна заклаў асновы навуковай генетыкі ў Беларусі. А сёння мы ўжо выйшлі на салідны міжнародны ўзровень — большасць даследаванняў праходзіць на малекулярным узроўні, праводзяцца працы ў галіне генетыкі раслін, жывёл, мікраарганізмаў, чалавека. І ўсе даследаванні, лічу, могуць зрабіць значны ўнёсак у народную гаспадарку нашай краіны — гэта дапамога селекцыянерам, якія працуюць з раслінамі і жывёламі, медыцыне для дыягностыкі розных спадчынных захворванняў, беларускаму спорту ў адборы перспектыўных спартсменаў і г. д., — расказваў "Звяздзе" **дырэктар Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі Аляксандр КІЛЬЧЭЎСКІ.**

Па яго словах, сёння інстытут мае добрае сучаснае абсталяванне, а ў генетыку прыходзяць маладыя таленавітыя навукоўцы. Што тычыцца навуковых адкрыццяў, то Аляксандр Уладзіміравіч выказаўся пра гэта вельмі асцярожна:

— Ці ёсць некія сенсацыйныя адкрыцці? Ведаеце, я заўсёды баюся сенсацый, бо ёсць небяспека пустога стрэлу. Нам не столькі патрэбны сенсацыі, колькі паслядоўная праца ў многіх кірунках, якая арыентавана на задачы народнай гаспадаркі. Калі раней генетыкаў часта папракалі, што яны далёкія ад жыцця, то зараз гэта цяжка зрабіць: мы стараемся працаваць непасрэдна з практыкамі, дзе нашы веды запатрабаваны.

Але пра адзін цікавы праект "Звяздзе" расказаў яго расійскі калега, **Віктар Драгаўцаў, Акадэмік РАСГН, галоўны навуковы супрацоўнік Аграфізічнага інстытута РАСГН:**

— Мы зараз з Аляксандрам Кільчэўскім падрыхтавалі і абмеркавалі мегапраект: як рэзка паскорыць селекцыю і пачаць вельмі хутка ствараць магутныя гатункі. Кошт гэтага мегапраекта — 30 млн еўра, і ён ужо ўхвалены Камітэтам па навуцы і высокіх тэхналогіях Дзярждумы Расіі.

Праўда, па словах Віктара Аляксандравіча, гэтыя грошы пакуль не выдзелены — зараз вядуцца перамовы з Міністэрствам сельскай гаспадаркі Расіі. Калі не атрымаецца, то прыйдзецца звяртацца ў фонды Саюзнай дзяржавы ці СНД.

— У крайнім выпадку можам звярнуцца ў Азіяцка-Ціхаакіянскае эканамічнае супрацоўніцтва. Бо ў іх толькі за 2011 год колькасць галадаючых павялічылася на 40 млн чалавек. І для іх самае галоўнае — новая зялёная рэвалюцыя, новыя гатункі, каб выратавацца. А мы ведаем, як гэта рабіць, мы ўжо заклалі першыя эксперыменты. Я вам так скажу: сёння ў свеце няма нікога бліжэй да новай зялёнай рэвалюцыі, чым мінскі, новасібірскі і санк-пецярбургскі інстытуты!

Па словах Віктара Драгаўцава, калі праект будзе рэалізаваны за свае грошы (а не за заходнія гранты), то ён стане працаваць на Беларусь і Расію:

— Можна будзе прымаць заказы ад любых краін і працаваць па заказе. Усе алгарытмы і праграмы будуць закрыты, а гатункі будзем рабіць на заказ.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**